*Весці БДПУ. Серыя II – 2005. – № 2. – С.130 – 132.*

**Новыя спартыўныя традыцыі: пошукі, шляхі вырашэння**

Апошнім часам на Беларусі мэтанакіравана ажыццяўляецца праграма прапаганды здаровага ладу жыцця ў грамадстве. І гэта ўжо мае добрыя вынікі. Па-першае, дасягненні беларускіх спартсменаў, якія прымаюць удзел у міжнародных спаборніцтвах, усё больш высокія і значныя, што абумовіла ўзнікненне хвалі масавай цікавасці да міжнародных спартыўных падзей. Алімпійскія гульні, чэмпіянаты па тэнісу, футболу, хакею і іншых відах спорту сёння засяроджваюць увагу мільёнаў беларусаў. Па-другое, жыхары Беларусі, якія не звязаныя з прафесійным спортам, часцей выбіраюць актыўны від адпачынку і актыўна ўдзельнічаюць у аматарскіх спартыўных спаборніцтвах. Прыкладам таму з’яўляецца правядзенне Дзён здароўя на прадпрыемствах і ва ўстановах адукацыі, Рэспубліканская лыжня і мясцовыя марафоны, масавае наведанне спартыўных баз, фізкультурна-аздараўленчых цэнтраў, басейнаў і рэспубліканскіх гарналыжных курортаў.

Аднак, у сучасны момант шырока не разглядаецца магчымасць аб’яднання людзей пад час правядзення спартыўнага свята, заснаванага на традыцыйных гульнях беларусаў, на неабсяжнай спартыўнай спадчыне народа. І гэта нягледзячы на тое, што такія спартыўныя відовішчы, калі цэнтральнае месца належала менавіта народнай гульні, ужо праводзіліся на Беларусі. Ды і забавы, падобныя да сучасных спартыўных гульняў, можна знайсці ў гісторыі развіцця традыцыйнай фізічнай культуры беларусаў. І таму хацелася б звярнуць увагу грамадскасці на неабходнасць звязваць праграму прапаганды здаровага ладу жыцця з адраджэннем беларускай культурнай спадчыны, з папулярызацыяй народных спартыўных традыцый, што забяспечыць выхаванне патрыятызму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пошук шляхоў вырашэння дадзенай праблемы і вызначыў ідэю арганізацыі і правядзення своеасаблівых Алімпійскіх гульняў на аснове традыцыйнай гульнёвай культуры беларускага этнасу. А эксперыментальнай пляцоўкай можа стаць факультэт народнай культуры Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», дзе аб’яднаны розныя спецыяльнасці: фалькларысты, харэографы, спартсмены, мастакі, і таму востра паўстае пытанне арганізацыі фізічна-аздараўленчай работы са студэнтамі з улікам спецыфікі факультэта.

Беларусіяда – рабочая назва мерапрыемства, у аснову якога павінны быць пакладзены найбольш адметныя народныя гульні, выбраныя па прынцыпах беларускіх традыцый, распаўсюджанасці па рэгіёнах, відовішчнасці і накіраванасці на развіццё разнастайных спартыўных якасцяў. Прыкладам такіх гульняў могуць стаць: «Пекар» і «Лапта» - актыўныя і захапляючыя гульні на спрытнасць і кіданне ў цэль для ўдзельнікаў розных узростаў; розныя «выбівайлы» - рухавыя забавы з мячом, напрыклад, «Два агні»; гульні на хуткасць - «Абгонкі» («На пераспехі»), «Французы і беларусы», «Дзікары і беларусы», «Даганялкі» («Пятнашкі»); дужанне (барацьба), гульні «Пацяг», «Перацяжкі» - сілавыя відовішчы з традыцыйнымі правіламі; стральба з рагаткі і іншыя. Неабходна прадугледзець розныя віды спаборніцтваў - камандныя і асабістыя; камбінаваныя эстафеты.

Для арганізацыі і правядзення Беларусіяды павінны быць складзены пэўны Статут, які будзе дакладна вызначаць усе яе палажэнні, звязаныя з:

арганізацыяй свята: перыядычнасць правядзення, у якую пару года праводзіцца, у які час, на якіх пляцоўках (адкрытыя ці закрытыя, іх памеры);

праграмай свята: з якіх этапаў складаецца, якія гульні ўваходзяць у спартыўную частку мерапрыемства, дакладна апісаныя правілы, вызначаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спартыўны інвентар, парадак і паслядоўнасць удзелу індывідуальных гульцоў і каманд, прынцып выяўлення пераможцаў.

складам удзельнікаў мерапрыемства: колькасць людзей у камандзе, узроставыя абмежаванні, пол гульцоў;

Але да ўдзельнікаў свята трэба ставіць не толькі патрабаванні фізічнай падрыхтоўкі, сілы, спрытнасці, але і абавязковы паказ невялікай культурнай праграмы, заснаванай на традыцыйнай беларускай культуры (так было калісьці на кірмашах). Вынікі мерапрыемства падводзяцца, зыходзячы з фальклорнага выступлення, удзелу ў індывідуальных відах спаборніцваў, камандных гульнях і калектыўных эстафетах. Такім чынам, месца каманды ў агульным заліку будзе вызначацца па колькасці заваяваных перамог ва ўсіх частках Беларусіяды.

На нашу думку, асноўныя арганізацыйныя пытанні спартыўна-культурнага руху на факультэце павінна вырашаць спецыяльна створаная структура, напрыклад, факультэцкі камітэт Беларусіяды, у склад якога могуць уваходзіць супрацоўнікі і студэнты кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання і аздараўленчай фізкультуры, выкладчыкі і студэнты кафедры этналогіі і фалькларыстыкі, якія займаюцца даследаваннямі па праблемах народных гульняў і забаў, педагогі кафедры тэорыі і гісторыі культуры, якія даследуюць гісторыю народных гульняў, кафедры мастацкай і педагагічнай адукацыі, якія дапамогуць прафесійна арганізаваць афарміцельскую работу да свята. Дадзены камітэт павінен прымаць рашэнні, якія датычацца арганізацыі свята, яго ўдзельнікаў, удакладнення праграмы мерапрыемства, вызначэння парадку гульняў і прынцыпаў выяўлення пераможцаў спаборніцтваў, і забяспечваць перадачу інфармацыі пра спартыўна-культурны рух. Неабходна стварыць мясцовыя камітэты на кафедрах.

Спартыўна-культурнае свята можа адбываецца з рознай перыядычнасцю. Праводзіць мерапрыемства можна на спартыўных пляцоўках

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ФНК: спартыўных залах, стадыёне, а таксама на выязных пляцоўках на адкрытым паветры. Тэрмін працягласці свята павінен вызначацца факультэцкім камітэтам і будзе залежаць ад колькасці ўдзельнікаў, ад праграмы мерапрыемства, ад часу, калі праводзіцца Беларусіяда.

Праграма Беларусіяды, як зазначалася, павінна складацца з двух блокаў: культурнага і спартыўнага. Неабходна, каб фальклорная частка праграмы праводзілася на адкрытай пляцоўцы і ў нечым нагадвала сабой кірмаш, дзе размяшчалася б шмат разнастайных атракцыёнаў, выступленняў артыстаў, паказальных спаборніцтваў, гумару. Кожная каманда павінна прадставіць невялікую праграму, пабудаваную на аснове традыцыйнай народнай культуры Беларусі. Праграмы ўдзельнікаў павінны ацэньвацца: улічваецца традыцыйнасць, прафесіяналізм выканаўцаў, відовішчнасць, арыгінальнасць, гумарыстычнасць, яскравасць і касцюміраванасць.

Другая частка свята – спартыўная.

Спаборніцтвы могуць адбывацца ў адзін этап ці ў некалькі, напрыклад, у тры этапы: чвэрцьфінал, паўфінал і фінал (такі варыянт правядзення магчымы пры ўдзеле вялікай колькасці каманд). Тады, згодна жараб'ёўцы, у чвэрцьфінале сустракаюцца ўсе каманды і ўдзельнікі па індывідуальных відах спаборніцтваў па ўсіх выпрабаваннях. У такім выпадку, гульні мэтазгодна праводзіць па прынцыпу выбывання: каманда ці ўдзельнік па індывідуальных відах спаборніцтваў, якія прайграюць, больш не маюць права гуляць у дадзеным відзе выпрабаванняў, а каманда ці гулец, якія атрымліваюць перамогу - выходзяць у паўфінал. Сустрэчы паміж рознымі камандамі адбываюцца на розных спартыўных пляцоўках. Прызавыя месцы прысуджаюцца па кожным з выпрабаванняў індывідуальна і за ўсе спаборніцтвы разам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абавязковымі этапамі усяго свята з’яўляюцца ўрачыстае адкрыццё і закрыццё Беларусіяды. Такім чынам, факультэт народнай культуры можа стаць той базай, якая ад эксперыментальнай і пачаткова-арганізацыйнай працы з цягам часу пяройдзе на наступныя этапы: правядзенне агульнауніверсітэцкіх спаборніцтваў, а затым і агульнанацыянальнага свята па народных відах спорту.

Як вынік, трэба адзначыць актуальнасць дадзенай праблемы, бо на сённяшні дзень паўстае неабходнасць папулярызацыі здаровага ладу жыцця, беларускай культуры і магчымасць яе аб’яднання з традыцыйнымі спартыўнымі выпрабаваннямі. Менавіта правядзенне агульнага свята фальклору і спорту будзе своеасаблівым штуршком да аднаўлення былых звычаяў. Арганізацыя такога відовішча мае вялікае выхаваўчае і развіваючае значэнне, паколькі фізічная падрыхтоўка моладзі з’яўляецца важнай і неад’емнай часткай у сістэме фарміравання гарманічна развітай асобы.

Мае сэнс, каб на факультэце пачаўся мяркуемы спартыўна-культурны рух. А гэта для навучальнай установы педагагічнага профілю мае вельмі вялікае значэнне.

Па-першае, папулярызацыя здаровага ладу жыцця, а таксама распаўсюджванне традыцыйнай культуры для саміх студэнтаў. У будучым свяце закладзены велізарны выхаваўчы і развіваючы патэнцыял, бо фізічная падрыхтоўка моладзі абапіраецца на глыбокія народныя карані.

Па-другое, будучы педагог, прайшоўшы праз такое спартыўна-культурнае выпрабаванне, панясе ў школу дух патрыятызму, любові і пашаны да народных традыцый, зробіць штуршок да аднаўлення былых звычаяў, ды і проста папоўніць свой уласны запас гульняў, забаў, якія можна выкарыстоўваць у паўсядзённай працы з дзецьмі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па-трэцяе, зараз часта вядуцца размовы пра тое, што сучаснае студэнцтва зусім хваравітае, абцяжаранае тэарэтычнымі заняткамі і вядзе нерухомы лад жыцця, таму задор і жыццесцвярджальны дух народных спаборніцтваў дапаможа маладым людзям адарвацца ад клопатаў і можа стаць гарантам весялосці і добрага настрою для ўсіх ўдзельнікаў.

Па-чацвёртае, такое мерапрыемства дапаможа аб'яднаць студэнтаў розных кафедр факультэта народнай культуры, бо агульнае свята збярэ ўдзельнікаў і балельшчыкаў розных спецыяльнасцей, што дапаможа пашырыць кожнаму сваё кола неафіцыйных зносін з аднагодкамі, узбагаціцца новымі ўражаннямі і знаёмствамі.

*Дрыгін Анатоль Віктаравіч*
*аспірант кафедры этналогіі і фалькларыстыкі*
*Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Разглядаюцца магчымасці аб’яднання сучаснай фізічнай культуры з народнымі спартыўнымі традыцыямі беларускага этнасу. Тэарэтычна абгрунтоўваецца ідэя ўзнікнення спартыўна-культурнага руху на аснове беларускіх традыцый і прапануецца канцэпцыя правядзення на базе факультэта народнай культуры БДПУ спартыўнага свята, заснаванага на народных гульнях.

The possibilities of joining modern physical culture with folk sports traditions of Belarusian ethnography are examined. The ideas of the beginning of the sports-cultural movement on the base of Belarusian traditions are substantiated theoretically, and the idea of conducting the sports holiday basing on the folk games at the Faculty of Folk Culture of the Belarusian State Pedagogical University is offered.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ